View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE

УДК 947.6 (476)

# НАШ КРАЙ У ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

***М.В. ЦУБА***
*Палескі дзяржаўны універсітэт,*
*г. Пінск, Рэспубліка Беларусь*

1 жніўня 1914г. пачалася Першая сусветная вайна. Беларусь стала прыфрантавой паласой Паўночна-Заходняга фронту. Ужо ў першы дзень вайны з'явілася распараджэнне мінскага губернатара аб увядзенні ў Мінскай губерні, у склад якой ўваходзіў Пінскі павет, ваеннага становішча. У сувязі з гэтым уся паўната ўлады перадавалася тут у рукі ваенных, а спецыяльныя пастановы начальніка Мінскай вайсковай акругі генерала Е.А. Рауш фон Траунберга, выдадзеныя ў гэты час, падкрэслівалі, што ўсе асобы, у тым ліку і грамадзянскае насельніцтва, «... падлягаюць ваеннаму суду і пакаранню па законах ваеннага часу аж да смяротнай кары: 1) за бунт супраць вярхоўнай улады, 2) за наўмысны падпал... і г. д.» [1]. Акрамя таге, прысланы ў Пінск яшчэ адзін цыркуляр фон Траунберга патрабаваў ад мясцовага кіраўніцтва «самым уважлівым вобразам ставіцца да настрояў насельніцтва і да ўсіх праяў грамадскасці. У выпадках малейшага супраціўлення натоўпа патрэбна рашуча прымаць крайнія меры аж да прымянення, згодна існуючым правілам, зброі» [2]. Вялікае значэнне ў гэты час надавалася прадухіленню забастовак на Палескай чыгунцы. У пастанове Асобага камітэта пры кіраванні Палескай чыгункі ад 14 жніўня 1914 г. паведамляецца: «Асобы камітэт лічыць неабходным падтрымліваць беспераpыўныя правільньм зносіны на станцыях Ліда, Баранавічы, Лунінец, Ваўкавыск, Маладзечна, Гомель і Пінск» [3].

Нягледзячы на ваенны час і прынятыя у сувязі з ім меры, грамадскае жыццё на Піншчыне да сярэдзіны вясны 1915 г. працякала адносна спакойна. Гэта назіраецца з паведамленняў перыядычнага друку: «Дзякуючы таму, што Пінск сёння з'яўляецца адным з галоўных пунктаў оптавага гандлю суконных вырабаў, у Пінск прыязджаюць купцы з больш буйных гарадоў Паўночна-Заходняга краю за таварам, таксама ўзмацнілася дзейнасць мясцовых крэдытных устаноў па правядзенню розных грашовых аперацый», а таксама: «…группа віцебскіх капіталістаў-тэхнікаў распачынае перамовы аб прадастаўленні ім дазволу на ўсталяванне ў Пінску электрычнага асвятлення. Мяркуецца па атрыманні дазволу адразу распачаць працу, звязаную з пабудовай электрычнай станцыі» [4].Так, па знойдзеных архіўных матэрыялах можна меркаваць, што вялікую ролю ў грамадска-палітычным жыцці пінчан адыгрывала яўрэйская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя «Паалей-Цыён» (Рабочыя Сіёна), так як менавіта ў Пінску ў сакавіку 1915 г. адбылася агульнадзяржаўная канферэнцыя гэтай партыі, якая выпрацавала свае падыходы і пазіцыю ў адносінах да Першай сусветнай вайны [5].

Аднак сітуацыя хутка пачала мяняцца ў сувязі з наступам кайзераўскіх войск (канец красавіка - май 1915 г.) на Усходнім фронце, калі расійская армія, якая панесла вялікія страты, вымушана была адступіць з Польшчы. Гэта наклала свой адбітак і на публікацыях артыкулаў у мясцовай газеце: «На брацкіх праваслаўных могілках на сродкі ваеннага фонду пабудавана прыгожай архітэктуры драўляная царква-часоўня. У хуткім часе адбудзеццаяе святочнае асвячэнне» [6] (мал. 1).

ПолесГУ

Мал. 1. Царква-часоўня паўшанаванні памяці ахвяр Першай сусветнай вайны. 1915 г.

У гэтай жа газеце паведамляецца аб дастаўцы ў горад параненых на фронце салдат: «29 красавіка (1915 г.) праз станцыю Пінск праследавала 1000 параненых, эвакуіраваных ў іншыя гарады. Некалькі соцень чалавек астаўлены ў Пінску і размешчаны ў мясцовых шпіталях» [7].

З лета 1915 г. Беларусь стала арэнай ваенных дзеянняў. Маўклівымі сведкамі кравапралітных баёў ад Брэста да Пінска і зараз з'яўляюцца шматлікія могілкі часоў Першай сусветнай вайны і доты (мал. 2).



Мал. 2. Могілкі часоў Першай сусветнай вайны на Піншчыне

Газета «Объединение», якая выходзіла ў Пінску да пачатку кайзераўскай акупацыі, летам 1915 г. пісала аб стварэнні пінскім гарадскім галавой В.П. Чайкоўскім Пінскага ваенна-прамысловага камітэта і аб мерапрыемствах па агульнай мабілізацыі [8]. Вядома, што ў тэты час на вайну было мабілізавана 53 % пінчукоў ад агульнай колькасці дарослага мужчынскага насельніцтва горада.

Пры набліжэнні фронта да Пінска амаль усё дарослае насельніцтва горада і павета прыцягвалася да выканання абарончых работ. У сувязі з гэтым пінская земская ўправа хадайнічала перад начальнікам Мінскай губерні аб дазволе «...выкарыстоўваць працу ваеннапалонных, бежанцаў і мясцовых жыхароў для выканання неадкладных работ» [9]. Пасля чаго гарадское кіраўніцтва старалася любымі сродкамі выправіць у глыбокі тыл як істотную частку мясцовага насельніцтва, так і шматлікіх бежанцаў, якія запаланілі Піншчыну. Жорсткую пазіцыю ў адносінах да такіх бежанцаў занялі ваенныя ўлады. Бачачы, што вялікая колькасць людзей перашкаджае хуткаму манеўраванню войскаў, галоўнакамандуючы Заходнім фронтам А. Эверт загадваў: «Тых, што не маюць прытулку і ўладкаваліся ў полі і буданах, высяляць прымусова на ўсход за Днепр, таму што, бадзяючыся без прытулку і ежы, гэтыя бежанцы з'яўляюцца пастаяннай пагрозай парадку і грамадскаму спакою» [10]. Па загаду Вярхоўнага Галоўнакамандуючага расійскай арміяй вялікага князя Мікалая Мікалаевіча, прыхільніка тэорыі «спаленай зямлі», пакінутыя непрыяцелю беларускія вёскі падлягалі бязлітаснаму знішчэнню, аб чым расказваюць і афіцыйныя звесткі германскага генеральнага штаба, якія паведамляюць аб ваенных дзеяннях у пінскім напрамку: «Уся мясцовасць, па якой адступаў праціўнік, была нямым сведкам супраць падпальшчыкаў уласнага народа. Усюды, куды ні прыходзілі нашы войскі, яны знаходзілі пакінутыя і людзьмі, і жывёламі груды камянёў, на якіх то тут, то там тырчалі трубы. Даволі рэдка пападаліся цэрквы, над якімі злітаваліся нават казакі. Вось і ўсё, што ўцалела на шляху адступаючых расійскіх армій» [11, с. 44-45]. У сваю чаргу ў аглядзе расійскай надзвычайнай следчай камісіі адзначаецца: «...У жніўні 1915 г. у 8-мі кіламетрах ад Пінска варожая артылерыя абстраляла снарадамі з задушлівым газам табар бежанцаў» [12, с.796]. Спрабуючы абяліць сябе ў сувязі з вялікімі стратамі мірнага беларускага насельніцтва ў ходзе наступления пад Пінскам і ўсю віну зваліць толькі на расійскія войскі, германскае камандаванне паведамляла ў зводцы: «З лютасцю, якая гіавінна выклікаць у нашага народа і войскаў пачуццё глыбокай агіды, рускія для маскіроўкі сваіх пазіцый пагналі тысячы людзей: сваіх землякоў - мужчын, жанчын і дзяцей насустрач нашаму наступленію. Нявольна ад нашага агню былі ахвяры» [11, с. 50]. Але гінулі людзі не толькі ад снарадаў і куль. Тыф, халера і іншыя хваробы, голад, адсутнасць медыцынскай дапамогі касілі людзей не менш, чым зброя.

15 верасня 1915 г. кайзераўскія войскі захапілі Пінск. Далей наступ немцаў быў спынены, і фронт надоўга стабілізаваўся непадалёку ад вёскі Гарадзішча. У выніку адна частка Пінскага павета аказалася пад уладай германскіх войск, а другая засталася пад расійскім падпарадкаваннем. У горадзе і навакольных вёсках былі раскватэраваны германскія салдаты (мал. 3).



Мал. 3. Нямецкія салдатыў Пінску. 1915 г.

Тут быў усталяваны жорсткі акупацыйны рэжым. Насельніцтва застаўлялі ў прымусовым парадку рамантаваць маеты, дарогі, нарыхтоўваць і вывозіць лес. Каб папярэдзіць выступленні супраць акупацыйнага рэжыму, германскія ўлады выдавалі пагады. Людзям забаранялася хадзіць альбо ездзіць з аднаго населенага пункта ў другі, нават для наведвання царквы патрэбны былі спецыяльныя пропускі. Не дазвалялася прадаваць мясапрадукты, лавіць рыбу, карміць коней аўсом, забіваць жыўнасць без дазволу і г. д. За самае нязначнае парушэнне распараджэнняў нямецкіх улад жыхары падвяргаліся штрафам, турэмнаму зняволенню і нават пакаранню смерцю.

Усё гэта выклікала справядлівае абурэнне пінчукоў. У выніку мелі месца факты забойства кайзераўскіх ваенных чыноўнікаў, падпалы будынкаў адміністрацыі і складаў з прадуктамі, дыверсіі на чыгунцы, а з канца 1915 г. ў наваколлі Пінска пачалі дзейнічаць групы партызан. Кіраўніцтва партызанскай барацьбой тут узначаліў А.М. Ільін. Але акрамя тутэйшых партызан, якім актыўна дапамагалі мясцовыя жыхары, на Піншчыне яшчэ знаходзіліся партызанскія атрады, накіраваныя сюды з Украіны камандаваннем Паўднёва-Заходняга фронту. Аб іх дзейнасці вядомы генерал А.А. Брусілаў расказвае наступнае: «Іваноў (галоўнакамандуючы Паўднёва-Заходнім фронтам), узяўшы прыклад з вайны 1812 г., загадаў сфарміраваць ад кожнай дывізіі ўсіх армій фронту па партызанскаму атраду, затым даў загад ім рушыць на паўночны захад Палесся, дазволіўшы поўны прастор для дзеянняў. ...Выходзілі бясконцыя непаразуменні з мясцовымі жыхарамі, прычым, прызнаючы толькі асабіста Іванова, гэтыя партызаны прычынялі безліч грабяжоў і мелі вельмі малую схільнасць ваяваць з ворагам. У апошнім я іх цалкам апраўдваў, бо на Пінскіх балотах рабіць конныя набегі было немагчыма, і яны нават калі б і хацелі весці конныя баі, усё роўна ні ў якім выпадку не змаглі б гэтага выканаць» [13, с. 169-170].

Безумоўна, балоцісты раён Агінскага канала не мог стаць спрыяльным месцам для поўнамаштабных ваенных дзеянняў, але, выкарыстаўшы дапамогу мясцовых жыхароў і расцягнутасць нямецкай абароны ў выглядзе сістэмы блак-гаузаў, расійскія войскі змаглі правесці тут сапраўды ўнікальную аперацыю. Даведаўшыся, што ў прыфрантавую вёску Невель прыбыла значная групоўка нямецкіх саддат і афіцэраў, штаб IV расійскай арміі пад камандаваннем генерала А.Ф. Рагозы стварыў спецыяльны знішчальны атрад у асноўным з мясцовых жыхароў, якія служылі ў расійскім войску. Ноччу, непрыкметна для ворага, гэты атрад з дапамогай мясцовых праваднікоў прабраўся праз лінію фронту і нечакана напаў на германскі гарнізон у Невелі. У выніку нападу былі знішчаны каля 500 нямецкіх салдат і афіцэраў і быў ўзяты ў палон нямецкі генерал. Вядома, што аперацыяй па разгрому германскага гарнізона ў Невелі камандаваў афіцэр расійскай арміі, поўны кавалер Георгіеўскага крыжа, тутэйшы жыхар, ураджэнец вёскі Махро С.І. Паўлюкавец [14, с. 99-100].

Складаным і небяспечным было становішча і ва ўсходняй частцы Пінскага павета. Цяжкасці забяспячэння, разруха на чыгуначным транспарце паставілі расійскую армію на фронце перад неабходнасцю самастойнага правядзення рэквізіцый. У выніку ваенныя ўлады прымушалі насельніцтва прадаваць зусім танна жывёлу, коней, фураж, харчаванне. На месцах баявых дзеянняў вытоптваліся сялянскія палі, знішчаліся пасевы. У дакладзе Пінскага павятовага ісправніка мінскаму губернатару ад 7 студзеня 1916 г. паведамляецца: «Настрой насельніцтва ў частцы павета, не захопленага праціўнікам, працягвае заставацца падаўленым і трывожным з-за апаскі, што вораг можа заняць астатнюю яго частку. Сялянскае насельніцтва павета толькі ў малой ступені занята дамашнімі работамі, так як па выпадку блізкасці ваенных дзеянняў сельскагаспадарчае жыццё поўнасцю разладжана... . З крымінальных злачынстваў болей вядомым з'яўляецца выпадак забойства з мэтай грабяжу ў ноч на 10 снежня 1916 г. двума невядомымі казакамі мяшчан аколіцы Сернічкі Пятра, Андрэя, Івана Палюховічаў і ранения ў галаву Карпа Палюховіча» [15, 19—20].

Полесгу

Голад, холад, бясправе, паражэнні ў вайне прывялі да масавага дызерцірства і марадзёрства расійскіх салдат, а таксама выклікалі сярод іх стыхійныя незадавальненні. Усё шырэй распаўсюджвалася братанне салдат варагуючых армій (мал. 4).

Ужо на пачатку 1917 г. разлажэнне расійскай арміі дасягнула такіх вялікіх памераў, што з былой вернай апоры царызму яна пераўтварылася ў грозную для яго небяспеку. У гэтым жа годзе адбываюцца Лютаўская і Кастрычніцкая рэвалюцыі, але найбольш паўплываўшай на падзеі на Піншчыне аказалася Лістападаўская рэвалюцыя 1918 г. ў Германіі. У сувязі з гэтай падзеяй нямецкі ўрад быў вымушаны адклікаць свае войскі з захопленых у ходзе вайны тэрыторый. А ў значнай ступені прыспешыла яго прыняць такія меры Палескае паўстанне, якое ахапіла ўвесь Пінскі павет. У ноч на 22 студзеня 1919 г. паўстанцкія палкі Разановіча і Казубоўскага разам з 152-м палком 17-й брыгады Чырвонай арміі ўступілі ў Пінск. Рэгулярных германскіх вайсковых часцей у горадзе ўжо не было.

Піншчына прайшла вялікі гістарычны шлях, на якім узнікала нямала цяжкасцяў. Аналіз падзей Першай сусветнай вайны не проста ажыўляе старонкі мінулага, але з'яўляецца напамінам сённяшнім людзям аб вайне як страшным і крывавым бедстве.



Мал. 4. Братанне расійскіх і нямецкіх салдат каля Агінскага каналу. 1917 г.

ПолесГУ

**ЛІТАРАТУРА**


1. НАРБ. - Фонд 705. - Воп. 1. - С. *21*.- Л. 59.
2. НАРБ. - Фонд 295. - Воп. 1. - С. 8600. - Л. 546.
3. ГА Мінскай вобл. - Фонд 295. - С. 10591. - Л. 59.
4. Да будет свет! // Объединение: Газета Полесья. - 1915. - 25 апреля.
5. НАРБ. - Фонд 60. - Воп. 3,- С. 73.
6. Выстроена церковь // Объединение: Газета Полесья. - 1915. - 1 мая.
7. Прибытие раненых // Объединение: Газета Полесья. - 1915. - 1 мая.
8. Большой сбор // Объединение: Газета Полесья. - 1915. - 12 июля.
9. Дело есть, рабочих нет // Объединение: Газета Полесья. - 1915. - 19 июля.
10. НАРБ.-Фонд 295.-Воп. 1.-С. 11011. - Л. 288.
11. Мировая война в отдельных операциях. Бои на реке Зап. Буге летом 1915 г. Обработана по официальным данным Германского Генерального штаба в 1917 г. капитаном Пэльман. - Петроград, 1921.-73 с.
12. Документы и материалы по истории Белоруссии (1900-1917 гг.). - Минск, 1953. - Т. 3.
13. Брусилов, А.А. Мои воспоминания / А.А. Брусилов. - М., 1983. - 267 с.
14. Памяць: гіст.-дакум. хроніка Іванаўскага раёна - Мінск: БЕЛТА, 2000. - 592 с.
15. НАРБ.-Фонд 295.-Воп. 1. - С. 9184. - Л. 19-20.

**OUR LAND IN THE DAYS OF WORLD WAR I**

*M. V. TSUBA*

***Summary***

This article is devoted to the events of World War I in Pinsk region. The author studies the influence of the war on the population of the region, analyses difficulties and hardships, which fell on many poleshuks during the introduction of martial law, mobilization, refuge-seeking, military actions in the region and occupation.

*Пастуціў у рэдакцыю 20 сакавіка 2008 г.*

ПолесГУ